http://www.uzdanews.by/?p=26051

Чырвоная Зорка
Грамадска-палітычная газета Уздзенскага раёна, выдаецца з 26 студзеня 1932 г.

# У ГАРМОНІІ ШАТАКАНА

***14.03.2014***



**8 сакавіка ў спартыўнай зале гімназіі прайшлі традыцыйныя рэспубліканскія спаборніцтвы па шатакан каратэ-до, прысвечаныя Міжнароднаму дню жанчын. Удзел у іх прынялі 243 прадстаўнікі з 23 клубаў з шасці абласцей нашай краіны і горада Мінска.**

**Ганаровымі гасцямі спартыўнага свята сталі намеснік старшыні райвыканкама Яўгеній Шкель, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Наталля Кананенка, дырэктар гімназіі Зінаіда Жукоўская і маці шасці дзяцей, прызёр рэспубліканскіх спаборніцтваў Алена Корвін-Кучынская.**



**Праграма мерапрыемства была насычанай.**

**Вытанчаныя і дакладныя рухі спартсменаў, апранутых у кімано, у час дэманстрацыі свайго майстэрства стваралі непаўторную атмасферу, насычаную энергетыкай усходняга баявога мастацтва.**

**– Асаблівасцю праграмы турніра, які праводзіцца ў нашым райцэнтры, з'яўляецца шырокае прадстаўленне дзяўчат-спартсменак і спартсменаў-бацькоў, а таксама спаборніцтвы па тушэнні свечак, якія лічацца ў шатакане своеасаблівым тэхнічным кантрольным тэстам майстэрства, – заўважыла інструктар Лілія Іванаўна Плахава.**



Дастойна выступілі прадстаўнікі ўздзенскай каманды: Іван Пруднікевіч (ІІ месца), Яўгеній Мухамеджанаў (IV), Уладзіслаў Пяткевіч (IV), Жанна Пятроўская (ІІ), Святлана Астравух (III), Ларыса Дашкевіч (IV), Ягор Дашкевіч (IV), Яўгеній Вішнеўскі (III), Аляксандр Жук (ІІ), Яўгеній Нікановіч (ІІ), Дзмітрый Колас (III), Аляксей Трацэўскі (ІІ).

Спецыяльныя прызы атрымалі Жанна Пятроўская (намінацыя "Лепшая ў камандзе Уздзенскага раённага клуба") і Алена Пруднікевіч (намінацыя "Самая абаяльная ўдзельніца").



**Ніхто ў гэты дзень не застаўся без падарунка. Спонсарамі выступілі райаддзелы ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, адукацыі, спорту і турызму, райкам БРСМ, раённая арганізацыя рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Белая Русь", уздзенскі клуб каратэ-до "Бушыдо" і індывідуальны прадпрымальнік Алег Латыш.**

**Вера ЛУКАШЭВІЧ.**

***НА ЗДЫМКАХ: Іван ПРУДНІКЕВІЧ з мамай Аленай; у час бою; Ларыса ДАШКЕВІЧ.***

**Фота Святланы ШЫДЛОЎСКАЙ.**